Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 7. Варыянт 6

Білет № 7. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х - 1980-ых гг.


Распрацоўнік: Яфімава Крысціна Андрэеўна, ДУА «Кароўчынская сярэдняя школа» Дрыбінскага раёна

Пытанні:

1. З апорай на крыніцу № 1 (картасхема) вызначыце, якія вобласці Беларусі найбольш пацярпелі пасля катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі?
2. З апорай на крыніцу № 2 (гістарычны дакумент) вызначыце, за што пажарны Васіль Ігнаценка быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга?
3. З апорай на крыніцу № 1 (картасхема) і крыніцу № 3 (тэкст) дакажыце, што аварыю на Чарнобыльскай АЭС можна характарызаваць як маштабную экалагічную і тэхнагенную катастрофу, у тым ліку для Беларусі?
4. Растлумачце, чаму ў Мінску ў 2000 г. быў устаноўлены помнік «Зван Нагасакі»?

Крыніца № 1

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі



Загрязнение территории Беларуси после чернобыльской катастрофы

Крыніца № 2

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

2. Пожар, возникший на одном из блоков Чернобыльской АЭС, удалось локализовать благодаря самоотверженности пожарных, в том числе уроженца Гомельщины **Василия Игнатенко. С женой Людмилой они жили в городе Припяти, что в Украине, вместе с другими сотрудниками Чернобыльской АЭС. Василий служил здесь в пожарной части. Они с Людмилой совсем недавно поженились и ждали ребенка. Авария случилась не в его смену. Однако, увидев пламя над станцией, он принял непосредственное участие в тушении пожара. Поднялся на крышу горящего реактора, спас жизни трех пожарных, потерявших сознание вследствие высокого уровня облучения. Полученная им доза радиации была смертельной. Чуть больше двух недель в больнице его навещала жена Людмила, не осознавая опасности для себя и их будущего ребенка. Ей говорили, что перед ней уже не муж и любимый человек, а радиационный объект. А она, как заклинание, повторяла в палате: «Я тебя люблю, мой Васенька!» Стремилась спасти любимого человека силой своей любви. Через два месяца после смерти мужа Людмила родила дочь, которая прожила пять часов. Вместе с Василием они еще до рождения назвали ее Натальей. На кладбище Людмила приносит цветы им обоим: мужу и дочери.



Василий и Людмила Игнатенко

25-летний пожарный был посмертно награжден орденом Боевого Красного Знамени. За подвиг во имя жизни нынешнего и будущих поколений, личное мужество и самоотверженность В. Игнатенко в 2006 г. удостоен звания Героя Украины. Ему установлен памятник в Брагине. Имя героического пожарного носит одна из минских улиц. Участники преодоления последствий аварии на Чернобыльской АЭС получили в народе название «ликвидаторы».

Вот так в жизни личная отвага и самопожертвование, страдания и любовь идут рука об руку. Вы ведь уже знаете, что такое любить маму и папу, бабушку и дедушку, сестру или брата. И в вашей жизни будет любовь, ради которой пожертвовал своей жизнью наш соотечественник Василий Игнатенко.

Крыніца №3

Аварыя нанесла Беларусі ўрон, роўны 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 г., – 23,3% тэрыторыі нашай краіны забруджана радыёактыўнымі ізатопамі, якія доўга не распадаліся. Для параўнання: па ўдакладненых па стане на 2016 г. звестках пасля аварыі было забруджана 6, 9% тэрыторыі Украіны і 0, 34% тэрыторыі Расіі. Ад радыеактыўнага забруджвання пацярпела 2,3 млн чалавек, г.зн. кожны пяты жыхар Беларусі. З гаспадарчага абароту было выведзена 20% зямель. У ліпені 1986 г. Вярхоўны Савет БССР прызнаў усю тэрыторыю Беларусі зонай экалагічнага бедства. Яе наступствы былі вельмі цяжкія для Беларусі. Ад радыеактыўнага забруджвання пацярпелі 17 еўрапейскіх краін. Асноўны ўдар прыпаў на Беларусь, Украіну, Расію.